**З вопыту рэалізацыі праекта «ШАГ – Школа актыўнага грамадзяніна» у дзяржаўнай установе адукацыі «Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа» Брэсцкай вобласці**

**Тэма:** “Радзіма мая Беларусь у асобах. Сям’я – пачатак усіх пачынанняў" (аб ролі бацькоў у стварэнні ўмоў для litrознабаковага развіцця дзяцей, значэнні сям'і і сямейнага выхавання)

**Мэта:** фарміраванне ў вучняў уяўленя аб узвышанай ролі сям’і ў грамадстве, фарміраванне адказнага стаўлення да стварэння будучай сям’і.

**Удзельнікі:** вучні 8-11 классов ДУА “Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа”



26 кастрычніка 2023 года ў ДУА “Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа” ў рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа актыўнага грамадзяніна» прайшла інфармацыйная гадзіна па тэме “Радзіма мая Беларусь у асобах. Сям’я – пачатак усіх пачынанняў" (аб ролі бацькоў у стварэнні ўмоў для рознабаковага развіцця дзяцей, значэнні сям'і і сямейнага выхавання).

Класны кіраўнік 9 класа Людміла Мікалаеўна Амбражук першы этап мерапрыемства пачала з цытаты Антона Сямёнавіча Макарэнка “Семья становится единственной первичной ячейкой общества, тем местом, где реализуется прелесть человеческой жизни, куда приходят отдыхать победные силы человека, где растут и живут дети – главная радость жизни”. Навучэнцы былі згодныя з выказваннем, адзначылі, што менавіта ў сям’і больш за ўсё хочацца дзяліцца сваімі радаснымі дасягненнямі і перажываннямі, толькі там можна адчуць шчырасць.

Падчас інтэрактыўнай віктарыны “Мы даведваемся” вучні актыўна адказвалі на пытанні, якія датычацца заканадаўства Рэспублікі Беларусь, той падтрымкі, якую сем’і атрымліваюць ад дзяржавы, сацыяльныя і творчыя ініцыятывы. Вельмі адметна, што сярод вучняў былі і тыя, чые матулі атрымалі “Ордэн Мацеры” і тыя рабяты, чыі сем’і атрымалі ўзнагароду па выніках раённага этапу конкурса “Сям’я года”. Вучні падзяліліся пачуццямі, якія прынеслі іх сем’ям гэтыя радасныя падзеі.

На мерапрыемстве прысутнічаў ганаровы госць – іерэй Сергій Ярашэвіч, настаяцель храма Пакрова Прэсвятой Багародзіцы аг. Люсіна. Падчас “ШАГа 2”, звяртаючыся да вучняў, Іерэй Сергій адзначыў, як важна паважліва ставіцца да сваіх бацькоў, цаніць іх працу, дапамагаць і старанна вучыцца. Таксама пад час гутаркі настаяцель акцэнтаваў увагу рабят на тым, як адказна трэба падыходзіць пры стварэнні сваёй будучай сям’і.






Вучні з вялікай ахвотай задавалі іерэю Сергію пытанні і з задавальненнем слухалі адказы, прыклады з яго асабовага сямейнага жыцця, пра цяжкасці ў выхаванні дзяцей і цікавыя іх вырашэнні.

У ШАГе 3 “Мы дзейнічаем” абмеркавалі выказвання Васілія Аляксандравіча Сухамлінскага «Семья – это та первичная среда, где человек должен учиться творить добро», у ходзе якога вучні прыйшлі да выніку, што чалавек з маленства вучыцца быць добрым у сям'і і павінен заўседы паважаць сваіх родных і бацькоў.

*Курылік А.А.,намеснік дырэктара па АД*
*ДУА «Люсінская сярэдняя школа*
*імя Якуба Коласа»*